■ Дзень смеху

# «Я ўзяў гусака на рукі і сказаў: «Спявай, Валера!»

**1 красавіка апантаныя жартаўнікі чакаюць з нецярпеннем. У гэты дзень любы жарт, нават самы праўдападобны, можна абумовіць проста: «Не крыўдуй! Сёння свята гумару!» Нашы сённяшнія суразмоўцы — музыканты, артысты, тэлевядучыя, — як пераканаўся карэспандэнт «Звязды», жартуюць пастаянна і па-творчы нечакана. Што з гэтага атрымліваецца, у якіх яны стасунках з Днём гумару, мы распыталі і ўсё занатавалі.**

**Віталь КАРПАНАЎ, лідар музычнага гурта «Дразды», вядучы праекта «Пін_код» на канале «Беларусь 2»:**



Фота Надзеі БУЖАН.

— Самы нечаканы розыгрыш здарыўся з нашай групай напрыканцы мінулага года. Мы ўдзельнічалі ў адборы на «Еўрабачанне-2016» з песняй «Павязу ў вёску». Гэта быў жывы эфір. Перад сцэнай — журы. Узровень сур'ёзны. Калі мы выходзілі на сцэну, сябры перадалі нам скрыню і сказалі: «Адчыніце яе на сярэдзіне сцэны. Там няма нічога страшнага». Мы так і зрабілі. І калі яе адкрылі, адтуль вылез сапраўдны гусак. Мы, безумоўна, былі агаломшаныя, шакіраваныя ўбачаным. Што зробіш, разыгралі нас класна. Але не спыняцца ж пасярод выступлення, праўда? Пачалі імправізаваць. Я ўзяў гусака на рукі і сказаў: «Спявай, Валера!» Так і выступілі з ім дуэтам. Пасля адбора птушкі разышліся па ўсім інтэрнэце. Як ён пачуваецца цяпер? Жывы, здаровы. Стаў сапраўднай «зоркай». Мае дзве сяброўкі-гусі. Нам пасля кастынгу на «Еўрабачанне» сталі паступаць розныя прапановы выступіць разам з Валерам. У маскоўскіх клубах гэта была б даволі прыбытковая справа.

**Ілья КОНАНАЎ, вядучы праграмы «Капейка ў капейку» на канале «Беларусь 2»:**



— Мы пастаянна жартуем з калегамі. І адзін з самых яскравых выпадкаў здарыўся з адной нашай калегай. На той час у яе была машына «Дэу Маціз». Такі невялічкі, кампактны аўтамабіль. Дык вось, ведаючы, што машына такая лёгкая, мы з хлопцамі захацелі праверыць, ці здолеем яе ўзняць. Аказалася, што зможам. У выніку мы вырашылі разыграць дзяўчынку і перанеслі аўто з адной паркоўкі на другую, цераз дарогу. Пасля стаім, чакаем рэакцыю знаёмай. Калі яна даведалася, што яе машыны няма на стаянцы, пачала тэлефанаваць у ДАІ, на ўсе найбліжэйшыя штрафстаянкі. Яна была ў адчаі, бо ніхто не мог сказаць, дзе знаходзіцца яе «Дэу». Хвілін дваццаць мы чакалі, а пасля сказалі: «Дык паглядзі цераз дарогу, вунь жа яна!» Дзяўчына гэтая вельмі спакойная, нават меланхалічная. Вывесці яе з сябе вельмі складана. Аднак тут я ўбачыў другі бок медаля. Яна на нас крычала і абуралася. Чалавека было не пазнаць.

Са мной падобных выпадкаў ніколі не здаралася. Ды і маю машыну наўрад ці нехта падыме. Але ў стане, калі шалёна шукаў аўто, а яго нідзе не было, я таксама аказаўся. Было тады крыўдна. Думаў, купіў машыну два тыдні таму, а яна ўжо знікла. Аднак у выніку знайшлася — на штрафстаянцы Дзяржаўтаінспекцыі.

**Дзмітрый КАРАСЬ, вядучы «Тэлебарометра»:**



— У маёй памяці адбіўся выпадак, які наўрад ці назавеш смешным, але ён стаў для мяне сапраўдным сюрпрызам. Мае аднакурсніцы — дзве Ірыны і Ганна — доўгі час жылі і працавалі ў Японіі. Мы пастаянна кантактавалі, гутарылі з імі праз інтэрнэт. І вось аднойчы я пайшоў у госці да нашых агульных сяброў. Мы дзесьці паўтары гадзіны размаўлялі, нешта абмяркоўвалі, і тут раптам нашы дзяўчаты, якія павінны былі быць на іншым канцы свету, заходзяць у пакой... Я адчуў, нібыта зямля сыходзіць з-пад ног. Арганізавалі вось такую змову. Для мяне гэта было неспадзяванкай, узрушэннем, сапраўдным сюрпрызам.

Што тычыцца смешных выпадкаў, іх хапала на здымках. Напярэдадні Года свінні мы здымалі святочны выпуск «Добрай раніцы, Беларусь!». Нам прывезлі парася з заапарка. Я трымаў яго ў руках і павінен быў віншаваць тэлегледачоў з надыходзячым святам. У гэты момант рэжысёр сказаў, каб я ўзяў жывёлінку бліжэй. А парасятка ўсхвалявалася і... Ну, вы разумееце, што яно нарабіла. Гледачы, гэтага, вядома, не пабачылі.

**Арцём ЛУК'ЯНЕНКА, саліст гурта NAVI, радыёвядучы:**



— Першага красавіка мая былая сяброўка аднойчы прызналася мне ў тым, што яна цяжарная. Шчыра кажучы, тады мне стала страшна. Я проста быў не гатовы да падобнага павароту ў сваім жыцці, меў зусім іншыя планы. Сядзеў, думаў, пераасэнсоўваў сваё жыццё... І толькі праз некалькі гадзін я ўсвядоміў, што гэта жарт, а сёння Дзень дурня. І калі яна прызналася, што гэта сапраўды жарт, я нават не сварыўся. Ведаеце, я доўгі час іграў у КВЗ, нават часам прысутнічаю ў журы. Люблю паглядзець «Камедзі батл», але такія жарты, як гэтыя, не люблю. Гэта занадта жорстка, танна. І... няправільна. І хачу параіць дзяўчатам, каб так з хлопцамі не рабілі. Усё ж такі ёсць шмат больш цікавых і прыемных жартаў.

**Вольга САЦЮК, спявачка, тэлевядучая хіт-парада «Сто песен для Беларусі» на «Беларусь 3»:**



— А мяне на першага красавіка ніхто ніколі не разыгрываў. І, шчыра кажучы, я гэтым не засмучана. Жартаваць трэба і ў астатнія дні. Мае сябры такія крэатыўныя, што не ведаеш, чаго ад іх чакаць. Яны здольныя на многае. І я думаю, што ў мяне ўсё яшчэ наперадзе. А цікавых, нечаканых выпадкаў на працы, якія межавалі з розыгрышамі, хапала. Вось, напрыклад, гісторыя. Я шмат гадоў запар удзельнічала ў Галоўнай ёлцы краіны. Спектакль быў адзін, але паказаў — шмат. І нам рэжысёр часам мяняў рэплікі, касцюмы, песні. Мог дадаць яшчэ аднаго героя. Напачатку, калі толькі даведалася пра гэта, крыху збянтэжылася. Але пасля адчула асалоду, бо гэта была сапраўдная імправізацыя на прафесійным узроўні.

Заўтра з тэлевядучым Антонам Мартыненкам мы будзем працаваць на гала-канцэрце міжнароднага фестывалю «Зорныя кветкі-2016», а сёння пойдзем да канкурсантаў і будзем жартаваць і разыгрываць іх. Пабачым, што атрымаецца.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# Беларусы скараюць Украіну

**Ёсць ужо не адзін прыклад таго, як артыст становіцца папулярным пасля ўдзелу ў тым альбо іншым шоу талентаў. Імёны Яўгена Літвінковіча, Сяргея Ваўчкова, Валерыі Садоўскай, Пятра Ялфімава, Руслана Аляхно і многіх іншых перыядычна мільгацяць у стужцы навін шоу-бізнесу. Нядаўна стартаваў шосты сезон украінскага тэлевізійнага праекта «Голас краіны», дзе сярод удзельнікаў зноў некалькі беларусаў.**

У першым выпуску шостага сезона ўкраінскага шоу талентаў спачатку фурор зрабіла мінчанка **Вікторыя Шайко.** Выканаўшы кампазіцыю «Daddy» (у арыгінале яе спявае шатландская спявачка Эмілі Сандэ), дзяўчына «разварнула» крэслы ўсіх чатырох суддзяў. Святаслаў Вакарчук, Іван Дорн, Ціна Кароль і Патап захацелі, каб Вікторыя стала ўдзельніцай іх каманды. Канкурсантка выбрала ў якасці настаўніка Патапа. У інтэрв'ю спявачка падзялілася гісторыяй пра ўласнага бацьку (з ім яна ніколі не бачылася) і патлумачыла, што адна з мэт яе прыходу на праект — каб тата яе ўбачыў і вывяў жаданне сустрэцца і пагаварыць...



Яшчэ адным удзельнікам, які прайшоў сляпыя праслухоўванні, стаў **спявак Юзары (ён жа Юрый Наўроцкі).** Паспрабаваўшы сябе на шматлікіх конкурсах, у тым ліку і на «Еўрабачанні-2015», артыст, відаць, вырашыў скараць новыя вяршыні, тым самым заваёўваючы сваім талентам прыхільнікаў у краіне-суседцы. «Я тут, таму што ўжо дастаткова папулярны ў сваёй краіне, і мне хацелася б паказаць сябе ва Украіне», — адзначыў артыст. На сцэне «Голасу краіны» ён выканаў песню Адама Ламберта «Ghost Town» і далучыўся да каманды Ціны Кароль.



А вось 23-гадовы **Яўген Клябанаў,** якога мы змаглі ўбачыць і пачуць на трэцім сляпым праслухоўванні, паведаміў карэспандэнтам, што асноўны яго цяперашні занятак — гэта праца ў адной музычнай групе. «Пакуль што мы іграем у карчме. Не займаемся творчасцю, а зарабляем грошы. Але ж хочацца выйсці і адыграць канцэрт выключна са сваіх песень. І гэтае шоу — прыклад таго, як людзі выходзяць на новы ўзровень у творчасці», — дзеліцца спявак. Пачуўшы ў яго выкананні песню «I Want to Break Free» групы Qeen, амаль адначасова павярнуліся Вакарчук і Дорн, і фронтмен гурта «Океан Ельзи» нават заявіў: «Калі вы пойдзеце да Івана, то я пакіну праект». Зразумела, Яўген не захацеў расчараваць свайго куміра і пайшоў да Вакарчука.



21-гадовы **Ян Яраш** ужо мае багаты вопыт працы клавішнікам у розных гуртах, а на шоу прыйшоў з мэтай спрабаваць свае сілы як сольны выканаўца, бо прызнаўся, што заўсёды хацеў спяваць. Перад выхадам на сцэну Ян сказаў: «У Беларусі не вельмі любяць сваіх артыстаў. А вось калі ў яго атрымалася нешта за мяжой — значыць, ён нечага варты. Я спадзяюся, што гэты праект дазволіць мне ажыццявіць маю мару». Затым праспяваў «Wicked Game» Крыса Ісаака, акампануючы сабе. Атрымаў станоўчыя водгукі і выбар пайсці ў каманду да Кароль ці Вакарчука. У выніку выбраў настаўнікам апошняга.



Пакуль яшчэ невядома, ці ўсе прэтэндэнты з Беларусі, якія жадаюць прадэманстраваць свае вакальныя і артыстычныя здольнасці на адным з найпапулярнейшых украінскіх шоу, прайшлі праслухоўванне, таму сачыце за наступнымі выпускамі «Голасу краіны» і падтрымлівайце нашых!

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*